Цана асобнаго нумэру 5 кап. (10 грошэй)

№ 4. Вильня, 27 сенцября 1906 г.

Год I.

Наша Доля

першая белоруская газэта для вёсковаго и местоваго рабочаго народу.

ВЫХОДЗИЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ рускими и польскими литэрами.

Адрэс рэдакции и администрации: *Вильня, Виленская вулица 32.*

Цана: з перасылкаю и дастаукаю да хаты: на 1 год—**3 руб.**, на 6 месяцоу—**1 руб. 50 кап.**, на 3 мес.—**75 кап.**, на 1 мес.—**25 кап.** Без дастауки и перасылки: на 1 год — **2 р. 40 к.**, на 6 мес.—**1 р. 20 к.**, на 3 мес.—**60 кап.**, на 1 мес. — **20 кап.** За границою: на 1 год—**4 руб.**, на 6 мес.—**2 р.**, на 3 мес.—**1 руб.** Перамена адрэсу—**20 кап.**

АБЪЯУЛЕННЯ прыймаюцця на наследний страницы на **20 кап.** за линейку пэтиту.

Рукаписы и карэспандэнции, присыланыя у Рэдакцию, мусяць быць чытэльна написаны з фамилею и адрэсом таго, хто яе присылае. Адрэс тольки для ведама Рэдакции.

Ад редакции

Абъяуляем што дзеля прычын ад Рэдакции незалежных »Наша Доля« больш выходзиць ня будзе. Грошы, прысланые **не на имя Ефстафiя Сымоховича** *ляжаць да гэтуль на почци у Вильни и дзеля таго просим их адтуль натрэбоваць назад. Другим нашым чытацелём па адлич.нию платы за высланые нумэры, грошы будуць адосланы. Аб уселяких справах редакции и администрации просим писаць да книгарни М. Пясэцкой-Шлапэлис у Вильни на Благавешчэнской вулицы № 13. Там жэ можна дастаць астаушыеся нумэры «Нашэй Доли".*

Вильня 27 верэсня (сенцябра).

Час новых выбороу да Гасударственной Думы прыближаецца. Першые начали ужо рухацца памешчыки,—и ня дзива. Якая была старая Дума—то была, а усёж таки ведамо, што папала у яе жменька таких людзей, каторые старалися на праудзи палепшычь жыццё усей працавитой беднаты.

Гэтая невяликая жменя шчырых прыяцелёу народной справы бачыла, што народу мало адной тольки свабоды, што яму еничэ патребна земля. Бачыла яна и тоя, што там, гдзе народ за землю паднимаўся процiу паноу, грабиу ды палиу их двары и палацы, правицельство насылало на мужыкоу войска; и шли праз вёски карацельные атрады, а гдзе яны прайшли, там лилася кроу мужыцкая, шли з дымом хаты и усё дабро мужыкоу. Гледзячы на усё гэта, зразумели выборные ад мужыкоу ды работникоу, што зямлю треба дабываць ня силаю, не грабежом, а законом, и дзеля таго начали у Думе дабивацца новых земельных законоу. Перш наперш хацели яны узяць зямлю (за плату або и без платы) ад тых, хто мае яе многа (ад казны, памешчыкоу и других), и усим тым, што або саусим ня маюць, або маюць надта мало зямли, даць яе стольки, каб кожны мог далей жыць на людзку,

карыстаць з навуки и усяго, што дала яна людзям.

Ведамо, што з таго ничога ня выйшло, бо Дума скоро была распушчэна. Але усё гэта нагнало страху намешчыкам. Што першую Думу разагнали, гэта ешчэ ничога не значыць: збярэцца другая Дума—можэ и яе разгоняць, — але таки прыдзе той час, кали народные выборные змогуць споунииь волю наслаушаго их працавитаго народу. Разумеюць гэта намешчыки и дзеля таго начали ужо цяпер рухацца каля выбороу. Нихто сабе ня хочэ зла, ня хочуць яго и намешчыки—ня хочуць разлучыцца з сваёй зямлёю; вось и робяць яны цяпер зъезды и згаварываюцца, як дабицца таго, каб у новую Думу напали тольки тые людзи, каторые будуць процину уселяких новых надзелоу ды новых земельных парадкоу.

А вёсковы народ ешчэ спиць. Спиць, бо ня ведае, якие будуць новые выборы, кали яны будуць, чы варта исци выбираць дэпутатоу, чы не? Уселяк у нас аб гэтым кажуць: адны ня хочуць выбираць дэпутатоу, бо думаюць, што Думу изноу разгоняць, кали яна станець за справу народную; другие думаюць, што треба прабаваць новаго шчасця.

Але сцеражонаго и Бог сцеражэ: хоць працавиты народ и не сказау сваего апошняго слова аб выборах, усёж таки трэба мужыкам ды работникам быць гатовыми да их. Трэба, каб яны ведали, каго выбираць у Думу, хто праудзивы прыяцель працавитаго народу. И усе павинны зразумець гэта, што и у работникоу, и у мужыкоу адны непрыяцели, адны справы, адна дарога каб палепшыць сваё жыццё. Дзеля таго усе яны павинны исци разам; разам дабивацца таго, каб у Думе мець силу, мець шмат сваих людзей.

У прошлых выборах непрыяцели народнаго шчасця и свабоды старалися раздзелиць нашых мужыкоу-беларусоу: каталикам казали, каб ня ишли яны разам з праваслауными, каб падавали свой голас абы за каго, каб тольки за каталика; праваслауных угаварывали, каб чуралися каталикоу ды выбирали канешне свайго праваслаунаго. Гдзе мужыки были цемные, гдзе яны наслухали хитрых слоу сваих непрыяцелёу, там не змагли яны на агульных выборах от губерний выбраць сваих дэпутатоу, и гэтаким парадком праскачыло у Думу больш выборных ад намешчыкоу ды усяких багачоу.

Гэтак быць цяпер не павинна!

Нехай же добра гэта помняць усе вёсковые людзи и усе працуючые, нехай идуць разам, бо усе яны—браты, и тады на новых выборах змогуць яны выбраць и наслаць у Думу сваих шчырых прыяцелёу и заступникоу.

Разумные ды не на дурня папали.

У Варшави палиция унадзилась трасци людзей на вулицах. Идзе сабе чэлавек спакойне, раптам бац—ватага палицэйских и крыкне: „Руки уверх“! И пашла рыцца на кишэнях, не мяркуючы, як свиня у гародзи. Добра, як пусто! Але як маеш якую забароненую паперку, газэтку, а крый Божэ рэвольвэр—ну, пойдзе тармасаванне ад аднаго участку, да другого, цягаюць ад Ананаша да Каифаша, пакуль ня выважэшся, ня пусцишь туману у вочы „храницелям парадку“, або не пашмаруеш, як следуе, свербячых пальцау.

Каб доуго не разводзицца, скажу коротка пра адно здарэнне:

Идзи сабе вулицей бунчучны пан. Аж торк палиція: „Руки уверх!“ крычаць. Пан шурцинь да кишэни, гадзинник у адну руку, партманку у другую и як бусел разпушчэными скрыдлами, так ён з паднятыми руками стау и смяецца перэд загневанным законом.

А закон, знаком тым палицэйские, сярдуе, просе и усё прыгледаюцца да партманки, як да дынаменту, або бомбы, тольки з близшой мэты.

Перэшукали, перэтрасли—пуста! Але усё таки ведуць да участку. Прывели, паставили перэд прыставомъ. Адзин з гарадавикоу вымае рэвольвэр браунинг з сваёй кишэни и кажэ: „Ось гаспадин, а ось—яго рэвольвэр и з гэтыми славами

палажыу яго на стол. Прыстау падскочыу да пана ды давай: „Как ты смеет, бунтаушчык, насиць аружье без разрэшэння начальства? „Я вам пакажу“ и тычэ кулак пад нос пану.

Але тут пан з сваёй стараны асрожыуся, адчыниу партманэ, выняу писульку и кажэ: „Вы ня маеце права мяне лаяць, бо я маю дазваленне насиць. Вот яно чытайце! А рэвольвэр мой вярнице мне назад“.

За рэвольвэр гарадавога ды у кишэнь. „Не маю тольки часу—кажэ—а тоб на вас паскаржыуся куды трэба“..

И вышоу, смяючыся. Прыстау накинууся на гарадавого за тое, што прывёу франта з разрэшэннем. А гарадавы злавау у душы, што прывёу франта з разрэшэннем, але без рэвольвэра. Франт насвистывау сабе, идучы вулицой. Чаму не свистаць: рэвольвэр найлепшаго калибру, вартуець рублёу з дванцаць пяць; сам як з вадою прыплыу. А Смех? Смех? Авечка сярэд воукоу; а воуки ани чэп!

(Крапиука)

Якое правицельство у Франции.

Францию цяпер завуць „рэспублика“. Штож гэта значыць? Чаму яе не называюць гасударствам, як напрыклад Расею, або каралеуством, як Гишпанию?

А вось чаму. Ня мае Франция таких кличэк, бо нима у ёй ани Цара, ани караля. Народ французски сам гаспадарыць у сваёй зямли. Ен выбирае сабе *прэзыдэнта* на сем годоу, плациць яму пэнсию и кажэ яму быць разом и галавою и слугою усяго краю. Як прэзыдэнт выслужыць свой срок, тады ён таки самы чэлавек, як и усе: можэ сабе и гараць, и касиць, и пастухом служыць, можэ и паном быць, кали на тое гроши мае.

Прэзыдэнт разом з министрами и чыноуниками вядуць парадок ва усей рэспублицы и спауняюць усё, чаго трэбуюць законы.

Законыж пишэ не прэдзыдэнт и не министры, а *парлямэнт* (тое што у нас Дума). Парлямэнт французски мае две палаты (адзелення): адна палата дэпутатоу, другая—сэнатороу.—Кожны член палаты дэпутатоу мусиць мець ня менш як 25 годоу, мусиць быць выбраны ад сотни тысяч людзей. Выбираць мае права кожны мужчына, каторы мае 21 год и не быу пад судом. Выборы сэкрэтные (нихто не знае, за каго кожны чэлавек падае голас) и простые (а не праз уполномочэных); выбираюць дэпутатоу на 4 годы.—Да палаты сэнатороу выбираюць членоу зъезды выборшчыкоу у кожным дэпартамэнци (шое, што у нас губэрния) Сэнаторы выбираюцца на 9 годоу. Праз кожные тры годы трэця часць сэнатороу идзе у атстауку, да хаты, а на гэта мейсцэ выбираюцца новые людзи. Новые людзи прыносяць часта з сабою и новые погляды народу, новые жадання, а з ими и новое жыццё. Таким парадком старые и аджыушые свой век погляды ня вельми запушчаюць корни у Французским сэнаци.

Кожнаму сэнатору и кожнаму дэпутату народ плациць пэнсию па дзесяць тысяч франкоу (на нашы гроши менш як чатыры тысячы рублёу) у год.

Усякая думка аб новым закони, усяки проект новых парадкоу пасылаецца да парляменту: або да палаты сэнатороу, або да палаты дэпутатоу. Тольки проекты, якие назначаць падатки, и рахунки расходоу и даходоу на кожны год—абсуждаюцца перш у палаци дэпутатоу, а пасля у палаци сэнатороу. Усе чыноуники—ад наменшаго да найбольшаго, хоць и назначаюцца прэзыдэнтом, але служаць пад контролем (даглядом) парлямэнту. Калиб, прымером, каторы министр аказауся злодзей, то парлямэнт зараз яго пад суд! И паедзе пан министр туды, куды Макар целят не ганяу!

Прэзыдэнт адкрывае и закрывае парлямент, але распусциць саусим палату дэпутатоу без згоды палаты сэнатороу ня можэ.

Часам бывае вось яки разлад: парлямент пастановиць яки колечы новы закон, а прэзыдэнт яго не спадабае и просиць змяниць. Тады парлямэнт бярэ закон назад и пярэглядае други раз. Але як ня знойдзе у ём ничога благога, ничога што трэба выкинуць або дабавиць, тады падае прэзыдэнту други раз той закон и кажэ- „Пане прэзыдэнце! Мы еще раз перагледзили новы закон и прызнали, што ён патрэбны и прыгодны для усяго французскаго народу. Просим падписаць!“

Тады прэзыдэнт ужо не мае права адказацца ад подпису, и закон с таго часу мае силу. Яго спауняюць усе: и сам прэзыдэнт, и министры, и чыноуники, бо ён—воля народных выборных. Ось яки парадок ва Франци. У ишных краёх людзи жывуць иначэй, але аб их пагаворым другим разом.

СОЛЬ.

Усим добра ведамо, як важна у жыццю нашэм соль: зраби якую кольвек страву бяз соли—то яна ня будзе нам смакаваць.—Соль значыць дадаець смаку; апрыч таго соль, як кажуць докторы, патребна нам для здароуя.

Кожны чалавек зъедае у год больш пятнадцаци фунтоу адной соли, а глядзице кольки гэта прыдзецца на усих людзей разом? А соль ня тольки идзе нам у яду: яе бяруць такжэ на фабрыки для уселяких патрэбносцей. И скуль дастаюць людзи стольки соли? Неж нигдзе ня сеюць и не видаць каб у нас сабирали; купляем мы яе у крамцы, а ня ведаем скуль яна прыйшла.

Вот аб гэтым мы з вами и хочэм пагаварыць цяпер. Сусед мой Франук, як вярнууся да хаты з войска, са службы, (—а служыу ён у матросах и ездзиу на мору на вяликих лодках, што караблями завуцца,) гаварыу, што у моры вада неякая салёная,—не такая як у нашых рэчках; яе пиць ня можна заусим—сунроцну яе наша вада выдаецца салодкою. Усе нашы вясковые и я сам ня надто хацели гэтаму верыць; думали мы, што ён байки баець; аж вот пасля, пачытаушы трошки книжачэк, набачыушы тае мора, я и даведауся, што Франук прауду казау. И дзиуным мне здалося, чаму гэта две, здаецца такие самые воды, маюць розны смак. Давай я дапытывацца и даведауся таки, чаму гэта так.

Соль, хаця яе заусим мало, была у зямли з самаго яе пачатку. Ведама вам, што соль добра распушчаецца у вадзе; вот выпадзе дождзик, прамочыць зямлю, соль распусцицца и з вадой паплывець у ручайки, пасля у рэчки, а потым и у мора.

Знаем мы усе, што як нальеш вады у миску и выставиш яе летам на двор, то вада у мисцы не пабудзе доуго—высохнець уся, а як сонцэ прыгрееиь, то высехне надта скоро. Так само высыхае вада и у моры, а соль астаецца; гэта вядзецца дауно, дауно, з самаго пачатку зямли, и цяпер у моры ужо шмат набралося соли, бо вада, што прынесла яе з рэчэк, ужо высохла: и таму у моры вада салёная.

Каб палучыць соль з марской вады, людзи гэту воду гатуюць у вяликих мисах. Вада уляциць парам, а соль астанецца. То што робиць агонь свасю гарачасцью, зробе и сонцэ, тольки на гэта трэба больш часу.

Далеко ад нас, едучы на палудзень у старану, куды бацяна, жураули, ластоуки и иные птушки ляцяць зиму зимаваць, есць край гдзе сонцэ так крэпко грэе, што нашэму брату цяжко дышаць. Не раз бывала у нас, што садзауки нашы летом высыхаюць, а нашэ сонцэ не так крэпко грэе, як тое. Вот и дадумауся той народ, што жывець у цеплых краях, каб солнышко яму давало з марской вады соль. Накапау ён на берэгу мора шмат садзаукоу, выбиуши глиной их дно, каб вада у зямлю не уцекла, и напаливау туды марской вады. Грэе сонцэ садзауки, вада высыхае и высыхае, а соль астаецса, як шмат вады высахне, соль и высыпецца на дно садзауки; тады яе сабираюць и разсылаюць на усе стораны света Божаго. У книжках нам кажуць, што даунейшая зямля была заусим непадобна да цяперашней. Там гдзе калисьци были далины, цяпер стаяць горы, там гдзе были рэки, цяпер их шма, там гдзе было морэ, цяпер суха—земля. Зрабилася гета таму, што земля у тых мейсцах калисьци паднялась—вот як расчына у дзежы. Падымецца земля, захопе кусок мора и адзелиць гэты кусок астальнога; зачне вада высыхаць, высохне уся, а соль и астанецца. Засыпяте гэту соль пяском, занясе зямлёй—и ляжыць так наша соль, Бог ведае як доуго, аж пакуль людзи не знайдуць яе и не выкапаюць усю. Так мы вот ужо знаем, што соль дастаюць з марской вады и капаюць з зямли. Цяпер пагаворым трошки аб тым, што такое соль и с чаго, скажэм мы, яна зроблена. Есць на свеци шмат уселяких металоу. Жалезо, што з яго робе каваль падковы, гвозди; медзь, што з яе зроблены самавары, краны; свинец што идзе на кули и шрот, серабро, золато, з

каторых куюць грошы. Гетые металы мы усе видзели и добра знаем; а ёсць метал надто дзиуный, бо хоць ён и блишчыць, як серабро, але не таки цвёрды як яно; мягки ён як воск и называецца натрий. Налейвады на серабро, з им ничога не зробицпа—серабро астанецца серабром, а капни на натрий вады, так ён загарыцца, а часами, крэпка стрэле астанецца пасля яго нечто белое.

Давялося вам пэуне чувачь што, у прыродзи ёсць разные газы. Вот хаця бы у паветры, што мы дышэм, ёсць азот, кислород... Адзин ёсць газ што называецца хлор,—надта кепска пахне и заусяды бывае у парашку—хлорной ванне (яе завуць такжэ бялильной извесцью па нашэму флёркам, што бабы бяруць пры мыцю бялизны и для бяленя палатна). Так вот гэты газ як злучыцца з металам натрием, то и зробицца соль. Можэ гэта и будзе выдавацца вам дзиуным, але прыпомнице, што нам хлеб робицца так само з двух матэрьялоу —муки и вады, а як даси хлеб на стол, то не спандзеш у ём особна ни муки ни вады. И у соли нема ни натрия ни хлору па асобку, бо яны там ёсць злучэные разам.

Элька.

З Беларуси и Литвы.

Зя Буцлава да „Нашэй Доли“ пишуць:

Шаноуна Рэдакцiя!

Кали знайдзецца мейсцэ у Вашэй „Доли“, напишыцяе и пра нашу тутэйшую долю.

Жывём мы тут з ласки... и па старанню нашаго памешчыка, дастауши кавалак пяску—рали, рудога балота—сенажаци и голых броду—пашы, усяга на 10 дзесяцин. Подзелиушыся цяпер рэдка хто можэ пражыць з зямли, а заработкау тут нима, дык нашаго народу усюды па Расеи досиць ёсць за работай и за хлебам. Выгану сваего не маем, але з прадвеку дзержым ад памешчыка кусок балота каля самых нашых гумен и поля, а за тое адрабляем яму и жнивом и возкаю гною.

Да нашаго багацтва належыць ешчэ шмат лесу сэрвитуту. Пекные штуки тут были, дык леташни год памешчык узяу ды прадау на пяць тысячоу пнёу. Узнялися нашы мужыки за гэта и давай раздицца, што рабиць, аж тут кажуць: лес то сэрвитутны, але памешчыки сёлета у силе, пачни што, дык зяраз атрад казакау прышлюць и ани пикни, ешчэ кармиць може прыдзецца. Думали прашэнне падаваць, але так и осталося. А памешчыку шанцуе: кали наш брат з бядоты суки падбираць пойдзець у гэты лес, дык або сякеру адбярэ лясник, або трапиць можэ пад бизунок урадника,—а у памешчыка нихто ни сякеры не адбирау, ни спины ни адзин палицэйски за наш супольны лес не перахрысциу. И казакау не было як памешчык лес сек. А што былоб, каб гэта мужики папрабавали сеч? не дай Бог: „крупные аграрные безпарадки!“...

Урадзило сёлета не завидна; бульба найгорш: и малая, и пагнила. А земскихъ падаткоу сёлета ад леташняго удвайне больш плациць выпадаець. Выкуп нибы даравали, а за тое, вот видзиш, у другим шчоци падбавили, и выходзиць: ня кием, дык палкой! як я парахавау, дык з нашай воласци выпадаець можэ кал 2000 рублёу земскихъ падаткоу. А на адных стражникоу, што ёсць штук з дзевяць у нашым мястэчку, выходзиць кал 30 руб. у месяц, у год больш трох тысяча. Вот куды нашы грошы дзеюцца. А ешчэ стражники дзивуюцца, за што на их народ не ласкау!

Да нашаго багацтва ещэ належыць начальная школа. З волосьци мы цлацим на яе чатырыста рублёу. Сёлета можэ яких з паутараста вучнёу ёсць, бедные, яны там як селядцы у бочцы; чужых валасцей дзяцей дык и не прымау вучыцель, не было мейсца. А вучыцель адзин, другого нема ещэ, дый той не па мысьлях нам, не глядзиць за дзетками, як дауней бывала другие глядзели; кажэць: на тое у их бацьки есць; и да навуки не цикавы; на нашу гэткую школу, ды як цяпер и двохклясную, трэба учыцеля учонаго, больш як з маладэчнянской сэминарiи.

Маем косцёл небагаты, але паказны: вялики, пекны, тольки не даець нам Бог такого ксендза, як у людзей. Наш ни до навуки, ни до жыцця: ён не знаець ни нашай мовы, ни нашаго народу. И гэтак найбольш коля нас по суседних порафьяхъ: усё лицьвяки ды жмудзяки. Их бы послаць у сваю старану, а да нас своих назначыць дык не: на Литву и Жмудзь шлюць нашых, а да нас полякоу

и найбольш лицьвякоу ды жмудзякоу, дзеля якой потрэбы? Каб таким народком польскосць надтрымаць у нас и на Литве и Жмудзи?....

А за тым жывице здаровы!

Астаюся ваш чытацель з Буцлава.

Адам Сталюк, па прозвишчу Альховая Тычка.

З Троцкаго павету нам пишуць: Было гэта праудзивое здарэнне у адной волосци Троцкаго павету.

Были тады па валасцёх бунты: прыехау аднаго разу да канцлярыи на успакаенне бунтоучыкоу сам прыстау. Як тут народ успакоиць, што тут парадзиць на каго усю беду мужыцкой, крыуды звярнуць? Ну, и звярнуу прыстау гэту беду на жыдоу.

„Гэты Хрыстопрадауцы жыды вас зводзяць—казау прыстау мужыкам.

„Яны вас да бунту намауляюць; гэта яны вашые пьяуки, яны з вас кроу сасуць. У их руках уся таргоуля, усюды жыд першы падойдзе, усюды яго верх..!“

Ведама, усюды жыд падойдзе, адазвауся мужык Саука, бо жыд грошы мае, начальству добра падсуне и, добра пан прыстау кажэш, усюды яго верх. А наш брат, мужык, так не парадзиць“.

Пачырвенеу на гэта прыстау, як бурак, але гаварыу далей, а мужыцких слоу якбы и ня слышау. Отож мели смеху вясковые людзинуж, брат Саука, кали цяу дык цяу, горэй як памордзи!...

Пранук Сомялиски.

З Игуменскаго павету Менск. губ. У вёсцы Кухцичы Уздзянскае валасьци недауно так сабе пад вечар, як усе шли с поля, прыйшоу нeяки хлапец, мусиць „сицилист“, паскликау усих мужыкоу, стау на прызби и начау голасно гаварыць. Гаварыу аб усём патроху, казау аб нашэй цяжкай доли, а пад самы канец угаварывау, каб не плацили падаткоу и не давали рэкрутоу, а найважней, каб злучалися у адзин вялики крэсцянски саюз. А яксокончыу казаць, пакинуу у вёсцы некие писульки и пашоу сабе. Праз два дни пачула палиция аб гэтым, у вёску прылящеу уратник са стражниками и нарабиу гвалту, каб аддали писульки. Суседни памешчык, кажуць, абецау за кожнаго такого „сицилиста, даваць па 25 рублёу таму хто зловиць и даставиць яму...

Юрко....

З Ляндварова. Сев.-Зап. Голос пиша, што граф Тышкевич стараецца дастаць дазваленне трымаць конную стражу у сваём дварэ и Ляндварови.

Як мы чули, то и шмат других памешчыкоу купляюць винтоуки ды наймаюць стражникоу, каб бараниць свае двары ад мужыкоу.

З усих старон.

Твер. Мужыки пагарэльцы рубяць казённы лес. Высланы казаки. (Сев.—Зп. Гол.)
— У Бежыцким павеци пазакрываны усе земские школы, бо нима на эта грошэй

(Таварыш)

З Каукaзу. Дзесяци генерал—губэрнатором, Наместнику и важнейшым чыноуникам пры канцылярнях генерал—губэрнатороу правицельство плоциць восемсот семдзесят чатыры тысячы сорок дзевяць рублёу. Апроч таго генерал-губэрнатором даюць кожны год на абстаноуку, на друкаванне патрэбных папероу и другие гэтакие рэчы семдзесяць тысяч рублёу. На разъезды и на другие патрэбы генерал—губэрнаторы бяруць кожны дзень ад пятнацаци да сотни тысячоу руб. (Таварыш)

Финляндзки Сэнат прыказау губэрнатором глядзець добра за войском, каб рэволюция не дайшла да яго (Строна)

Новочэркаск 22 сенцябра судзебная палата засудзила на поутара году *урадника* Турнова за *агитацию серэд салдатоу и казакоу*.

Варшава. Ужо тры дни, як арыштованые за политычные справы у турме, па прозвишчу Павяк, галадаюць. Гэтай галадоукаю яны хочуць дабицца палепшэння жыцця у вастрози. Некаторые ужо аж млеюць з голаду.

(Kurjer Lit.).

Масква. У Маскве нехто застрэлиу на вулицы капитана трэцяго грэнадзерскаго Пэрноускаго полка Дзенкоускаго, каторы камандавау салдатами, як усьмирали збунтаваушыхся арыштованых за политычные справы у Бутырской турме. Той, што стрэляу, уцёк.

Пабедоносцэу, быушы обэр-прокурор Свяцейшаго Сыноду, кажуць, усими силами стараецца не дапусциць агульнаго выборнаго права. (Страна).

Выборы да Гасударственой Думы, як кажэ газэта „Страна“, маюць быць не раней як у январы.

Гутарка аб гаспадарцы.

(Прадаужэние).

Я казау у прошлым нумэры „Нашэй Доли“, што вучоные людзи даведалися аб тым, што каб добра жыць усякае расценне патрэбуе асобную меру калн, фосфору и азоту; адны расцения бяруць больш фосфору, другие больш кали, трэцие больш азоту. Але скуль гэтые матэрьялы бяруцца у зямли? А яны там бяруцца з каменчыкоу, тольки што з камня збожэ высcаць их ня можэ, а трэба каб каменчыки, з каторых земля уся зложэна (бо земля зложэна з камнёу, вяликих и малых; нясок—дык тыеж каменчыки тольки маленькие, глина—так само)—каб гэтые каменчыки разсыпалися, як бы гнили, и каб з их выпадали такие часци, з каторых браць яду расценне можэ.

Ад дажджу, ад марозу, ад гарачыни вяликие и маленкие каменчыки трэскаюцца, разсыпаюцца и гэтакой дарогай у зямли збираецца расцицельная яда. Апроч таго яна там сабираецца тым, што добры гаспадар кладзе гной. У гнаю ёсць як раз многа фосфору, кали, а найбольш азоту: але гной мае еичэ такую силу, што ён намагае каменчыкам з каторых, як я ужо казау, зямля зложэна разсыпацца и тым самым багациць зямлю. Тольки што наши земли так ужо спустошэны, што на вэт часом гной не надта намагае, бо зямля так бедна, што расценне мае тольки гэту пишчу, што дастане з гною—а гэтаго мало. Вось и дайшли вучоные людзи да таго, што даведалися, што наша зямля бядней усяго у фосфор—а каб такой бядзе намоч прыдумали такие парашки, як их мужычки завуць, чы „искуственые удабрэння“ як завуць у гандлю, каторые маюць шмат адны—фосфору, другие—кали, трэци—азоту. Такие парашки, каторые маюць шмат фосфору, завуцца: супэрфосфат и томашлак; их два гатунки, усяки иначэй трэба упатрэбляць и на иншэй зямли—во и нагаворым аб их. Супэрфосфат мае фосфору шмат и патаму добра намагае на уражай тольки не на усих землях; найлепш ён аплачываецца на чорных землях, на глинистых, цяжэйшых; кали зямля надта ужо песчаниста, тады ня трэба класци яго, бо усё роуна не паможэ; а кали зямля глинистая хоць и не надта, тады добра ён намагае над пшаницу, над жыта, над ячмень, над лён. Найлепш класци яго на пагноях, бо хоць у гнои и ёсць фосфар, але на ту меру, якую гной маець кали и азоту—фосфору там мала, а як надсыпеш супэрфосфату, уражай выпадзе багаты. Супэрфосфат трэба пильнаваць, каб ня быу у кавалках и дзеля гэтаго, троха кунпушы, трымаць яго у сухим мейсцы, а кали ёсць ужо куски, трэба их разбиць на дробны парашок—найлепш их стаучы. Сыпаць яго трэба на дни 4—5 перад сяубой—роуна сеючы рукой на поли; трэба пильнаваць, каб ён скрось разсынауся роуна, (бо иначэй, збожэ нарасце купинами), а потым добра прыбаранаваць.

Антось Асина.

Гдзе шчасце?

Гдзе шчасце! Хто кажэ, што у лепшай доли,
Хто у зямли, у хлеби, у народнай воли,
У здароуи, у славе, уселякой раскошы,
Хто кажэ, што найлепей, кали ёсць грошы,
А нихто не намысле и не зразумее
Што без навуки гэта вецер чыста звее
И што без навуки, без добраго чытання
Ничога з багацтва людзям не застання.

Трэба, каб нашы дзеци вучились малые
Каб не гадавались як птушки лясные,
Каб книжэчку добру яны начытали,
Каб написаць умели, добра рахавали...
Як людзе уси будуць уму набирацца
Тады лягчэй на свеци будзе працавацца
Тады и багацтва, и счасця прыбудзе,
Шанаваць будуць близки и далёки людзе.

З. К.

Рэдактор-выдауца *Иван Тукеркес.*

Ад Рэдакціи.

Першы нумэр «Нашае Доли» па прыказу Виленскаго губэрнатора палиция конфискавала. Разышлася тольки палавина — пяць тысячоу, а пяць тысячоу палиция забрала, так што ничого схавацъ не удалося, и дзеля таго высылаць першы нумэр никому ня можем.

Просим у сих нашых чытацелёу писаць да нас, писаць аб усём, што дзеецца аб крыудаз сваих и радосьцях, хто як умее. Кали патрэбна будзе каму якая парада—пытайцеся—адкажэмо· Ведайце добра, што «Наша Доля»—газета вёсковых людзёу.

Прысылаючы грошы просим писаць, якое выданне «Нашае Доли» присылаць: чы друкаваное рускими литэрами, чы польскими.

Адресоваць грошы трэба канешне так: Вильня, Рэдакция «Нашае Доли», Ефстафiю Сымоновичу. Хто хочэ палучаць газэту, нехай паспишае з прысылкаю грошэй.

Рэдактор-выдауца **Иван Тукеркес.**

Типографія «**Артель Печатнаго Дѣла**», Вильна, уг. Большой и Рудницкой ул., д. Залкинда.